# Раённая спартакіяда "Актыўнае даўгалецце Ашмяншчыны", прысвечаная 680-годдзю г. Ашмяны і прымеркаваная да года народнага адзінства

10 верасня 2021 г. У г. Ашмяны прайшла раённая спартакіяда "Актыўнае даўгалецце Ашмяншчыны", прысвечаная 680-годдзю г. Ашмяны і прымеркаваная да года народнага адзінства. Мерапрыемства праходзіла ў фізкультурным зале ДУА «Гімназія №1г. Ашмяны». У спартыўным спаборніцтве вялі барацьбу дзве каманды, удзельнікамі якіх былі наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання ГУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» і навучэнцы 4-га класа ДУА «Гімназія №1г. Ашмяны».

Спорт аб'яднаў два пакаленні. У зале панаваў запал, спартыўны азарт, натхненне і актыўная падтрымка балельшчыкаў. Добры пазітыўны настрой, бадзёрасць духу, прыязнасць дапамаглі дарослым і хлопцам з лёгкасцю выканаць спартыўныя эстафеты і дасягнуць роўнай перамогі. Удзельнікі спартакіяды атрымалі граматы, Медалі і салодкія падарункі.

Спартакіяда стала святам спорту і здароўя!







